**В.Д.Старычонак**

# АТРЫБУТЫЎНЫЯ МЕТАНІМІЧНЫЯ МАДЭЛІ

Метанімічныя пераасэнсаванні атрыбутыўнага характару прадстаўлены ў літаратурнай мове і гаворках нешматлікімі прыкладамі, якія адлюстроўваюць асацыятыўныя сувязі паміж якасцямі, уласцівасцямі і прыметамі прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці. Сярод адносна невялікай колькасці мадэлей атрыбутыўнай метаніміі, якім не характэрна экспансія ў іншыя падсістэмы асацыятыўных сувязей, можна выдзеліць наступныя:

1. «Уласцівасць, стан» → «прычына гэтага стану» *літар.* ***радасць*** 'пачуццё вялікай асалоды, задавальнення – падзея, абставіны, якія прыносяць асалоду, шчасце', ***жудасць*** 'трывожнае пачуццё, страх, прадчуванне небяспекі – тое, што выклікае страх (трагічная з'ява, жахлівае здарэнне)', ***крыўда*** 'пачуццё горычы, выкліканае несправядлівымі ўчынкамі і паводзінамі – несправядлівыя ўчынкі і паводзіны ў дачыненні да каго-небудзь', ***уцеха*** 'радасць, задавальненне – тое, што (той, хто) прыносіць радасць, задавальненне'.

2. «Пэўная ўласцівасць» → «учынак, які характарызуецца гэтай уласцівасцю». Другасныя ЛСВ, утвораныя па гэтай мадэлі, як правіла, характарызуюцца яркай адмоўнай, негатыўнай канатацыяй, параўн.: *літар.* ***нахабнасць*** 'бесцырымоннасць, бессаромная назойлівасць – нахабны ўчынак', ***дурасць*** 'разумовая абмежаванасць – неабдуманы, бязглузды ўчынак', ***непрыстойнасць*** 'якасць непрыстойнага – непрыстойны ўчынак', ***подласць*** 'уласцівасць і якасць подлага – подлы ўчынак', ***нізасць*** 'подласць, ганебнасць – нізкі ўчынак', ***несправядлівасць*** 'уласцівасць несправядлівага – несправядлівыя ўчынкі, адносіны да каго-небудзь'.

3. «Уласцівасць, стан» → «месца: *літар.* ***круцізна*** 'уласцівасць крутога – крутое месца, абрыў', ***вышыня*** 'адлегласць ад асновы да вяршыні – узвышша, пагорак', ***няроўнасць*** 'уласцівасць няроўнага – упадзіны і ўзвышшы на паверхні чаго-небудзь', ***выпукласць*** 'уласцівасць выпуклага – выпуклае месца, пукатасць'.

4. Найбольш жа распаўсюджанымі з'яўляюцца атрыбутыўныя пераасэнсаванні, што ажыццяўляюцца па лініі «пэўная якасць» → «суб'ект, якому ўласціва такая якасць»., параўн. літар. ***геній*** 'самая высокая ступень творчай адаронасці, таленавітасць чалавека – чалавек, надзелены такой адаронасцю', ***талент*** 'надзвычайныя прыродныя здольнасці – чалавек з надзвычайнымі здольнасцямі', ***уцеха*** 'радасць, задавальненне' – 'той, хто з'яўляецца крыніцай, прадметам радасці, задавальнення', ***нікчэмнасць*** 'уласцівасць нікчэмнага – нікчэмны чалавек', ***пасрэднасць*** 'уласцівась пасрэднага – бясталентны, няздатны чалавек', ***аўтарытэт*** 'уплыў, агульнапрызнанае значэнне – асоба, якая карыстаецца заслужанай павагай, мае ўплыў', ***распуста*** 'распусны спосаб жыцця, раздуранасць – свавольнік, распуснік', ***бяссонніца*** 'нездаровая адсутнасць сну – асоба, якая не хоча ці не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

можа спаць уначы’. У межах гэтай мадэлі выдзяляецца значная колькасць яе разнавіднасцей, зафіксаваных у народных гаворках:

а) «лянота, гультайства» – «гультай, лодар»: *мсціcл.* ***бязулле*** *пін.*, *брасл.* ***лень*** *(Юрч.,ІІ; СП);*

б) «хлусня, выдумка» – «пляткар, выдумшчык, балбатун»: *рэч.*, *добр.* ***хімарда*** , *драг.* ***буза , шалда***, *мсціcл.* ***трылюдзішча, верзяя*** *(МСГ; ЗНС; ЛП; Юрч., І; Юрч.,ІІ);*

в) «бязглуздзіца, дурнота» – «дурань»: *тур.* ***дурнота***, ***дурніца*** *мсціcл.* ***дуралея*** *(ТС; Юрч.,ІІ);*

г) «вычварнасць, задаванне» – «вычварны, напышлівы чалавек»: *мсціcл.* ***вашапруддзе*** *(Юрч.,ІІ);*

д) «зайздрасць» – «зайздроснік»: *мсціcл.* ***завіда*** *(Юрч.,ІІ);*

е) «сквапнасць» – «сквапны чалавек»: *мсціcл.* ***жадоба*** *(Юрч.,ІІ);*

ё) «падбухторванне» – «падбухторшчык»: *мсціcл.* ***паджога*** *(Юрч.,ІІ);*

ж) «неахайнасць, бруд, гразь» – «неахайны, брудны чалавек»: *мсціcл.* ***гразнота, варзёпа*** *(Юрч.,ІІ);*

з) «ненасытнасць, ненажэрнасць» – «ненасытны чалавек»: *мсціcл.* ***несыць*** *(Юрч.,І);*

і) «шаленства, шал» – «шалёны чалавек»: *глус.* ***шаленец*** *(Янк.,ІІ);*

к) «беднасць, галеча» – «бядняк»: ***галота***, *мсціcл.* ***галатва, злыдня*** *(Юрч.,ІІ; Бяльк.);*

л) «розум, здольнасць» – «разумны, здольны чалавек»: *мсціcл.* ***растаропа*** *(Юрч.,І);*

м) «хвароба, нядужасць» – «хілы, хворы чалавек»: *мсціcл.* ***нядуга*** *(Юрч.,ІІ);*

н) «бяда, нядоля» – «няўдалы чалавек»: *астр.*, *іўеў.* ***нядоля***, *чэрв.* ***няўдача,*** *б.-каш.* ***ліхалецце*** *(СП; Шат.; МСГ)* і інш.

Рэалізацыя атрыбутыўнай мадэлі можа ажыццяўляцца і ў складаных структурах, метанімічныя ЛСВ у якіх спалучаюцца і цесна ўзаемадзейнічаюць з метафарычнымі, параўн.: ***благата́*** 1) *паст.* ‘зло, нядобры ўчынак’; 2) *віл.* ‘гора, нядоля’; 3) *паст.*‘дрэнны настрой, цяжкія перажыванні’; 4) *лід., навагр.* ‘тое, што не мае каштоўнасці’; 5) *віл.* ‘калатня’; 6) *іўеў., свісл.* ‘благі, злы чалавек’; 7) *дзярж.*‘пераборлівы чалавек’*(СП; СГЦ; НС)*. Першыя пяць ЛСВ звязаны метафарычнымі адносінамі і ўтвараюць семантычную парадыгму пэўных якасцей, квалітатыўных прымет, шосты і сёмы ЛСВ носяць метанімічны характар і характарызуюцца пеяратыўнай афарбаванасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ